Ала КЛЕМЯНОК

# ПЕТУШЫНАЯ ПОМСТА

Верай і праўдай служыў Пецька шмат гадоў сваім гаспадарам. Спраўна ахоўваў курыны гарэм, рэгулярна таптаў курачак, не падпускаў да куранят суседскага ката Пірата і першым апавяшчаў пра ўзыход сонца сваім гучным “Ку-ка-рэ-ку!” Аніводнага разу ён, у адрозненні ад іншых пеўняў, не клюнуў падшыванца Віцьку, які так і цэліў у яго з рагаткі або, дзеля смеху такіх як сам задзірлівых шалапутаў, цкаваў на яго Тузіка. Тузік, як усе дужа адданыя гаспадару сабакі, быў крыху дурнаваты і аднойчы ледзьве не задушыў Пецьку. Выратаваў Віцькаў тата – Вася. Але не толькі за гэта любіў певень Васю. Часцяком, вяртаючыся з рыбалкі, гаспадар частаваў птушку смачнымі чарвячкамі, што засталіся ў банцы з-пад маянэзу. Для Пецькі тады было свята.

Нічога дрэннага, акрамя як пачастунку, не прадбачылася, калі аднойчы Вася падыйшоў да пеўня, пагладзіў ласкава спіну, нават узяў на рукі і накіраваўся уздоўж хлява да паленніцы. Толькі ля калоды, на якой сяклі дровы, птушка раптам захвалявалася, асабліва ў момант, калі моцныя васькавы пальцы сціснулі шыю, прыціскаючы галавой да дрэва. Адным вокам Пецька ўбачыў лязо сякеры і з усяе сілу ірвануўся б’ючы паветра рабымі крыламі так, што пёркі пасыпаліся з іх нібы з падушкі, якую вясной пасля прасушкі выбівала віцькава бабуля Зося. Певень біўся ў агоніі, пырскі крыві ляцелі ва ўсе бакі. Няшчасная ахвяра не магла ведаць, што яго прэстыжнае месца хутка займе маладзейшы певень, а яго бліжэйшая перспектыва – знемагаць у супе.



***

Па настойліваму грукату ў дзверы было зразумела, што на парозе не вельмі прыязныя госці. Ды і час занадта ранні для гасцявання. Яшчэ і певень не прапеў. Хаця, ён і не мог прапеть, яго зварылі ўчора. Васька, чухаючы патыліцу, накіраваўся ў сенцы. Пару секунд спатрэбілася, каб вітальня напоўнілася прадстаўнікамі ўлады ў форме і ў штацкім. Шум і грубыя галасы пабудзілі соннае каралеўства, нават Віцька саскочыў з палацяў і з цікавасцю вылупіў зенькі. Яго тата Вася меў выгляд дужа збянтэжаны. Міліцыянеры спрабавалі надзець яму на запясце наручнікі, а мужчына супраціўляўся патрабуючы тлумачэнняў.

З гвалтам кінуліся на ратаванне жанчыны, залямантавала малодшая Віцькава сястрычка. Вэрхал узняўся такі, што ў бліжэйшых дамах паадчыняліся вокны, адкуль павылазілі скудлачаныя пасля начы галовы суседзяў.

– Маўчаць усім тут! – раўнуў мужчына ў цывільным, які, па ўсяму відаць, быў галоўны ў гэтай праваахоўнай дэлегацыі. Ён махнуў галавой і прайшоў у гасцёўню, следам увялі Ваську, не выпускаючы з моцных міліцэйскіх рук. Цывільны сеў на падлакотнік фатэлі, пільна ўсвідраваў вочы ў твар падазраванага. Зося, вохкаючы і жагнаючыся, пачала сабіраць з крэслаў параскіданую ўнукамі з вечара вопратку. Віцька схапіў свае нагавіцы і надзяваючы, на ўсялякі выпадак, непрыкметна выцягную з кішэні рагатку, якую тут жа сунуў пад услончык, на якім сядзеў.

– У нас ёсць неаспрэчныя доказы, што вамі здзейснена забойства, – як мага спакайней распачаў цывільны. – Ваша віна будзе палегчана, калі вы самі дабравольна прызнаецеся ва ўчыненым злачынстве.

Ізноў загаласілі кабеты, заякатала з жаночай салідарнасцю малая. Віцька, вылупіўшы вочы, пераводзіў погляд з бацькі на міліцыянтаў, не верачы вушам і таму прымяркоўваючыся якога са службоўцаў першым укусіць, каб даць магчымасць уцячы татку. Але той аслупянеўшы, з нейкай дурнаватай усмешкай на твары, здаецца, нікуды не збіраўся ўцякаць. Пасля таго, як цывільны яшчэ разы два паўтарыў свае абвінавачванні, Вася раптам страсянуў галавой і асіплым ад хвалявання голасам спытаў:

– Я выбачаюся, але хачу даведацца каго, дзе і калі я забіў?

– Гэта мы самі хацелі б ведаць. І вы нам зараз жа пра гэта скажаце! У нас ёсць доказы, што вамі здзейснена злачынства.

– Якое злачынства? Пра што вы кажаце?

– У нас ёсць неаспрэчныя факты і доказы!

– Якія?

Цывільны падняўся, прайшоўся па пакоі, пільна ўглядаючыся ў твары прысутных. Спыніўся ля вакна, нібы штосьці заўважыўшы за празрыстымі фіранкамі. Затым, не паварочваючыся да абвінавачваемага спытаў:

– У вас ёсць алібі на ўчарашні дзень? Куды вы ездзілі ўчора на сваёй машыне?

– Якое яшчэ алябі? – не даўшы рот аткрыць мужу загаманіла Віцькава маці. – Ён тры дні анікуды не ездзіў, бо няма грошы на бензін. Усю зарплату прасадзіў на свае вуды ды на рыбалку! Суткамі на возеры сядзіць, мяне ўжо ад яго рыбы ванітуе!

– Вам не давалі слова! – рэзка абсадзіў следчы жанчыну. – Куды вы ездзілі ўчора вечарам? Дзе пакінулі машыну?

Васька ачохаўшыся, упэўнена прамовіў:

– Анікуды я не ездзіў. Машына стаіць за гумном. Там бензіну кот наплакаў. Можа за вёску і выеду, але не далей. Ды можаце ў суседа Ванькі спытаць, ён учора прасіў яго да станцыі падкінуць, то я і яму сказаў, што калі заліеш бак, дык давязу.
– Што ж, хадзем, паглядзім на машыну, – прамовіў цывільны і рашуча накіраваўся да выхаду. Следам за ім пайшлі міліцыянеры і Васька з усім сваім сямейством. А каля плота ўжо стаялі жыхары ледзьве не са ўсёй вёскі. На гвалт сабраліся цікаўныя і ціха перашэпталіся, выказваючы кожны сваю версію падзей, так рана пабудзіўшых гэтым выхадным днём вяскоўцаў.

На дварышчы следчы прапусціў наперад гаспадара, а той прайшоўшы пару крокаў у накірунку гумна, рэзка павярнуўся і збянтэжана спытаў:
– А дзе ж мая машына?
– А куды ты ўчора ездзіў? – ізноў зароў следчы.
– Анікуды я не ездзіў, – яшчэ мацней зароў на яго Вася.

Яны так голасна крычэлі, што чулі ўсе прысутныя. І нехта з суседзяў пацьвердзіў:
– Учора вечарам машына была, я бачыў!

Далейшая гутарка праходзіла ў доме. Следчы выцягнуў з пакета брудную, заляпаную крывёй вопратку і, звяртаючыся да гаспадара спытаў:
– Чыя?
– Мая, – спакойна адказаў той.
– А чаму яна ўся ў крыві?
– Дык я пеўня ўчора засек. Жонка патрабавала мяса, а грошы няма, бо спінінг купіў і воблеры для начной рыбалкі. Певень нармальны быў, мог бы пажыць, але ж жонка не любіць рыбы…
– А чаму вопратка гэта аказалася ў машыне?

Цішыню, што павісла ў напружаным паветры, парушылі ўсхліпы Віцькі:
– Дзядзечка, прабачце, гэта я кінуў бацькаву вопратку ў машыну. Мне тата сказаў яе ў лазню занесці і ў тазік кінуць, каб вадой заліць. Але мяне хлопцы чакалі, а ў лазню, дзе пральная машына стаіць, несці далёка. Я думаў, што пагуляю, а вечарам занясу. Забыўся…
– Забыўся! Певень! Спінінг! Воблеры! Мы яшчэ праверым чыя кроў на вопратцы! – з грозным выглядам цывільны запіхнуў кашулю назад у пакет і накіраваўся да дзвярэй. – Што вы ў яго ўцапіліся як шчупакі ў плотку, – гыркануў ён у бок міліцыянераў, якія з цяжкасцю стрымлівалі смех.
– Дык, а мая машына дзе? – нясмела спытаў Вася.
– Дык за вёскай, у кувеце! – перадражніў яго адзін з міліцыянераў. – Толькі туды і даехалі угоншчыкі, заглохла твая тачка без бензіну.

Як пазней стала вядома, кінутую машыну знайшлі раніцай рыбакі. Паведамілі ў міліцыю. Супрацоўнікі аўтаінспекцыі зразумелі, што нехта ўкраў яе, бо, заводзілі не ключом, а народным спосабам – правадкамі. Знайсці гаспадара аўтамабіля – не праблема, але ў салоне ляжала акрываўленая кашуля…

Малады следчы, правінцыйны Шэрлак, тым не менш правёў расследаванне, каб упэўніцца, што кроў петушыная і на горшае зладзейства Вася не здольны.